**УДК 572.029:930(476)"18"** **DOI 10.52928/2070-1608-2024-69-1-35-41**

# ПАМЯТНЫЯ КНІЖКІ ГУБЕРНЯЎ ЯК КРЫНІЦА ДЛЯ ВЫВУЧЭННЯ СМЯРОТНАСЦІ ПРАВАСЛАЎНАГА НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСІ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XIX СТ.[1]

***канд. біял. навук, дац. В.А. ЕМЯЛЬЯНЧЫК***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай)***

*У артыкуле прадстаўлены вынікі аналізу статыстычных звестак, апублікаваных у Памятных кніжках беларускіх губерняў за 1858–1864 гг. Устаноўлена, што статыстычныя даныя аб смяротнасці, апублікаваныя ў Памятных кніжках Віцебскай губерні за 1862–64 гг., не з'яўляюцца дакладнымі і характарызуюцца істотным недаўлікам дзіцячых смерцяў. Пікі смяротнасці ва ўсіх даследаваных групах прыходзяцца на ранні дзіцячы ўзрост. Доля памерлых дзяцей ад агульнай колькасці смерцяў вышэй у сельскай мясцовасці, чым у гарадах. І ў гарадах, і ў сельскай мясцовасці назіраецца павышаная смяротнасць хлопчыкаў ва ўзросце да 5 гадоў у параўнанні з дзяўчынкамі. У дарослым узросце пачынаюць праяўляцца адрозненні характару мужчынскай і жаночай смяротнасці ў гарадах і сельскай мясцовасці. У сельскай мясцовасці назіраецца некаторае павышэнне колькасці памерлых жанчын рэпрадуктыўнага ўзроту ў параўнанні з мужчынамі. Для гарадоў характэрна адваротная сітуацыя: смяротнасць мужчын працаздольнага ўзросту значна перавышае жаночую смяротнасць.*

***Ключавыя словы:*** *Памятныя кніжкі губерняў, статыстыка смяротнасці, гарадское і сельскае насельніцтва, полаўроставае размеркаванне смяротнасці.*

**Уводзіны.** Смяротнасць з'яўляецца важным інтэгратыўным паказчыкам, які адлюстроўвае агульны стан здароўя насельніцтва і ўмовы яго жыцця. Даследаванне смяротнасці ў гістарычнай рэтраспектыве дазваляе прасачыць уздзеянне комплекса прыродных, гістарычных і сацыяльна-эканамічных фактараў на стан здароўя насельніцтва розных эпох. У сувязі з адносна познім з'яўленнем дэмаграфічнай статыстыкі на тэрыторыі Беларусі адной з галоўных крыніц вывучэння смяротнасці з'яўляецца палеадэмаграфія, заснаваная на аналізе пола-ўзроставага складу пахаваных у межах аднаго могільніка. Адной з галоўных праблем палеадэмаграфіі з'яўляецца неаднолькавая ступень захаванасці шкілетных матэрыялаў. Так, вядома, што большасць даследаваных археолагамі могільнікаў характарызуецца недаўлікам дзіцячых пахаванняў, у сувязі з тым, што дзіцячыя парэшткі захоўваюцца значна горш у параўнанні з парэшткамі дарослых індывідаў. У гэтай сувязі важна прасачыць агульныя заканамернасці пола-ўзроставага размеркавання смяротнасці ў папуляцыях з агульным тыпам узнаўлення насельніцтва. З моманту ўзнікнення дзяржаўнасці і да канца XIX ст. на беларускіх землях захоўваўся аграрны тып эканомікі, для якога ўласцівы т.зв. традыцыйны, ці патрыярхальны, тып узнаўлення, які характарызуецца раннім узростам уступлення ў шлюб, высокай нараджальнасцю ў спалучэнні з высокай смяротнасцю дзяцей і нізкай сярэдняй працягласцю жыцця.

Адной з ранніх крыніц дэмаграфічнай статыстыкі Беларусі з'яўляюцца Памятныя кніжкі, якія выдаваліся губернскімі статыстычнымі камітэтамі, пачынаючы з сярэдзіны XIX ст. Гэта былі афіцыйныя даведнікі, у якіх размяшчаліся каляндарныя, адміністрацыйныя, гісторыка-краязнаўчыя звесткі, а таксама статыстычныя матэрыялы. У статыстычных раздзелах Памятных кніжак публікаваліся даныя пра колькасць насельніцтва ў гарадах і паветах, яго саслоўны і канфесійны склад, а таксама даныя пра натуральны рух насельніцтва (колькасць народжаных і памерлых).

Асаблівасцю Памятных кніжак губерняў, асабліва іх першых выданняў, была адсутнасць адзінай структуры і розная якасць адпаведнага інфармацыйнага напаўнення раздзелаў. На змест канкрэтных выданняў уплывалі розныя фактары, у тым ліку фінансавыя магчымасці камітэтаў, а таксама інтарэсы іх сакратароў [1, с. 183–184]. У гэтай сувязі, ня гледзячы на пэўнае структурнае падабенства, Памятныя кніжкі асобных губерняў мелі свае індывідуальныя асаблівасці. Так, у статыстычных раздзелах Памятных кніжак звычайна прадстаўлены звесткі пра агульную колькасць народжаных і памерлых за мінулы перыяд. Пры гэтым дэталізаваныя даныя пра колькасць памерлых па гарадах і паветах з улікам полу і ўзросту ўтрымліваюцца толькі ў некаторых выданнях: у Памятнай кніжцы Мінскай губерні за 1861 г. [2], Памятнай кніжцы Магілёўскай губерні за 1861 г. [3], Памятных кніжках Гродзенскай губерні за 1860 г. і 1866 г. [4–5], а таксама ў памятных кніжках Віцебскай губерні за 1864, 1865 і 1866 г. [6–8]. Даныя пра полаўзроставае размеркаванне смерцяў па Віленскай губерні ёсць толькі ў Памятнай кніжцы за 1861 г., аднак без уліку канфесійнай прыналежнасці, а таксама без падзелу на гарадское і сельскае насельніцтва.

Яшчэ адной асаблівасцю Памятных кніжак, на якую звяртаюць увагу даследчыкі, з'яўляецца тое, што статыстычныя даныя, асабліва тыя, што публікаваліся ў першыя гады існавання камітэтаў, не заўсёды з'яўляюцца дакладнымі [9, с. 3; 1, с. 187]. Тлумачыцца гэта шэрагам прычын, у тым ліку адсутнасцю строга распрацаваных праграм для збору звестак, адсутнасцю неабходнай кваліфікацыі ў членаў статыстычных камітэтаў [1, с. 187–188].

---

[1]Артыкул падрыхтаваны ў межах праекта Беларускага рэспубліканскага фонда фундаментальных даследаванняў "Пахавальныя помнікі Полацка XI–XVIII стст. у кантэксце развіцця сінхронных некропалей Беларускага Падзвіння: пахавальны абрад, інвентар, палеаантрапалагічная характарыстыка" (нумар дзяржаўнай рэгістрацыі 20221071 ад 06.07.2022).

Мэта даследавання – вызначыць, у якой ступені статыстычныя даныя аб смяротнасці насельніцтва, апублікаваныя ў Памятных кніжак беларускіх губерняў, могуць лічыцца дакладнымі, а таксама прасачыць заканамернасці пола-ўзроставага размеркавання смяротнасці ў групах гарадскога і сельскага насельніцтва Беларусі другой паловы XIX стагоддзя.

**Асноўная частка.** У аналіз былі ўключаны статыстычныя даныя пра смяротнасць праваслаўнага гарадскога і сельскага насельніцтва Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай, Гродзенскай губерняў. Матэрыялы Памятных кніжак Віленскай губерні не разглядаліся, паколькі, як было ўказана вышэй, звесткі аб смяротнасці насельніцтва там прадастаўлены без уліку канфесійнай прыналежнасці, а таксама без падзелу на гарадское і сельскае насельніцтва. Паколькі пытанне пра дакладнасць статыстычных даных Памятных кніжак губерняў застаецца адкрытым, для параўнання былі прыцягнуты статыстычныя звесткі пра натуральны рух насельніцтва Магілёўскай губерні за 1871–1881 гг. [10]. У табліцы 1 прадстаўлены даныя пра пола-ўзроставы склад памерлых, разлічаныя на падставе матэрыялаў указаных Памятных кніжак.

Табліца 1. – Пола-ўзроставы склад памерлых

| Губерня | Год | Агульная кольскасць памерлых, чал. | Склад, % | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | Індывіды старэй за 15 год | | Індывіды маладзей за 15 год | |
| | | | Мужчыны | Жанчыны | Дзеці | *у т. л. немаўляты да 1 года* |
| *Сельская мясцовасць* | | | | | | |
| Мінская | 1858 | 22155 | 17,7 | 22,1 | 60,2 | *18,9* |
| Магілёўская | 1859 | 22752 | 17,1 | 19,6 | 63,4 | *18,9* |
| Гродзенская | 1859 | 11424 | 15,7 | 20,3 | 64,0 | *20,9* |
| Гродзенская | 1864 | 14884 | 15,4 | 18,9 | 65,7 | *23,8* |
| Віцебская | 1862 | 14821 | 33,7 | 42,2 | 24,0 | – |
| Віцебская | 1863 | 16434 | 34,0 | 30,0 | 36,0 | *9,0* |
| Віцебская | 1864 | 14294 | 30,1 | 28,2 | 31,7 | *7,6* |
| *Гарады* | | | | | | |
| Мінская | 1858 | 744 | 31,8 | 16,7 | 51,5 | *22,4* |
| Магілёўская | 1859 | 1707 | 25,8 | 16,1 | 58,1 | *23,3* |
| Гродзенская | 1859 | 571 | 33,3 | 17,4 | 49,4 | *25,2* |
| Гродзенская | 1864 | 617 | 31,9 | 17,3 | 50,7 | *21,7* |
| Віцебская | 1862 | 1080 | 38,2 | 26,9 | 34,8 | – |
| Віцебская | 1863 | 2300 | 34,5 | 29,8 | 35,7 | *7,2* |
| Віцебская | 1864 | 2840 | 32,4 | 34,2 | 33,3 | *3,8* |

***Дзіцячая смяротнасць.*** Як бачна з табліцы 1, у сельскай мясцовасці Мінскай, Магілёўскай і Гродзенскай губерняў доля дзяцей, якія памерлі ва ўзросце да 15-ці год, складала больш за палову ад агульнай колькасці смерцяў (ад 60,2% да 65,7%). Даныя па Віцебскай губерні паказваюць істотна ніжэшыя паказчыкі (24,0,3–36,0%). Адрозненне статыстычных даных па Віцебскай губерні яшчэ больш выразна прасочваецца на прыкладзе смяротнасці немаўлят. Ва ўсіх губернях, за выключэннем Віцебскай, працэнт немаўлят, якія памерлі ва ўзросце да 1-го года, вар'іруе ў межах 18,9–23,8%. У матэрыялах Памятнай кніжкі Віцебскай губерні за 1862 г. звесткі пра смяротнасць немаўлят зусім адсутнічаюць, а статыстычныя даныя за 1863 і 1864 год паказваюць надзвычайна нізкую для таго часу смяротнасць немаўлят – 7,6 і 9,0% ад агульнай колькасці смерцяў.

Статыстычныя даныя пра смяротнасць у гарадах Мінскай, Магілёўскай і Гродзенскай губерняў паказваюць, што доля дзяцей, якія памерлі ва ўзросце да 15 гадоў, складала каля паловы ад агульнага ліку смерцяў, дасягаючы 49,4–58,1% (табліца 1), тым часам як у гарадах Віцебскай губерні гэты паказчык, як і ў выпадку з сельскім насельніцтвам, аказваецца заніжаным і складае ўсяго каля трацiны ад агульнай колькасці смерцяў (33,3–35,7%). Працэнт немаўлят, якія памерлі ва ўзросце да 1-го года, ва ўсіх губернях, за выключэннем Віцебскай, вар'іруе ў межах 21,7–25,2%, у той час як матэрыялы Памятных кніжак Віцебскай губерні паказваюць або поўную адсутнасць даных пра смяротнасць немаўлят (1862 г.), або значна ніжэйшыя, у параўнанні з іншымі губернямі, паказчыкі (7,2 і 3,8% ад агульнага ліку смерцяў паводле даных за 1863 і 1864 год).

Паколькі працэнт дзіцячых смерцяў ад агульнай колькасці памерлых можа залежаць ад долі дзяцей у жывой папуляцыі, для аб'ектыўнай ацэнкі ўзроўню смяротнасці немаўлят ў дэмаграфіі выкарыстоўваецца такі паказчык, як працэнт памерлых немаўлят да 1-го года на 100 народжаных. У табліцы 2 прадстаўлены даныя пра смяротнасць немаўлят, разлічаныя намі на падставе даных пра колькасць народжаных і памерлых, апублікаваных у Памятных кніжках губерняў.

Як бачна з табліцы 2, паказчык смяротнасці немаўлят па Віцебскай губерні значна ніжэй, чым у іншых губернях, і вагаецца ў межах 4,8–8,0%. П.І. Куркін у сваім дэталёвым даследаванні, прысвечаным статыстыцы дзіцячай смяротнасці ў Еўропе канца XIX – пачатку XX ст., адзначае, што ў гэты перыяд мінімальны ўзровень смяротнасці немаўлят не апускаўся ніжэй за 7–8%. Падобны нізкі паказчык назіраўся ў найбольш развітых у сацыяльна-эканамічных адносінах рэгіёнах, такіх, як Скандынавія, альбо ў сацыяльных групах з высокім статусам

і ўзроўнем дабрабыту, такіх, як каралеўскія сем'і Еўропы [11, с. 5]. Калі прыняць матэрыялы статыстыкі па Віцебскай губерні за верагодныя, то давядзецца дапусціць, што як у гарадах, так і ў сельскай мясцовасці губерні дзіцячая смяротнасць была ніжэйшая за еўрапейскі мінімум. Пры гэтым адсутнічаюць любыя падставы меркаваць пра існаванне нейкіх асаблівых умоў жыцця праваслаўнага насельніцтва Віцебскай губерні пачатку 60-х гг. XIX ст., што маглі б спрыяць радыкальнаму зніжэнню дзіцячай смяротнасці. Найбольш верагодна, што нізкі працэнт дзіцячых смерцяў у Віцебскай губерні тлумачыцца няпоўнасцю апублікаваных даных. Гэта не дзіўна, бо дакладная фіксацыя дзіцячай смяротнасці ў Расійскай імперыі з'яўляецца не раней за 80-я гг. XIX ст. [12, с. 25].

Табліца 2 – Каэфіцыент смяротнасці немаўлят

| Губерня | Год | Працэнт памерлых немаўлят да 1 года на 100 народжаных | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | агульны | хлопчыкі | дзяўчынкі | розніца |
| *Сельская мясцовасць* | | | | | |
| Мінская | 1858 | 11,6 | 12,2 | 11,0 | 1,2 |
| Магілёўская | 1859 | 11,7 | 12,4 | 11,0 | 1,4 |
| Гродзенская | 1859 | 10,1 | 10,8 | 9,4 | 1,4 |
| Гродзенская | 1864 | 12,4 | 12,8 | 11,9 | 0,9 |
| Віцебская | 1862 | – | – | – | – |
| Віцебская | 1863 | 7,2 | 6,5 | 8,0 | -1,6 |
| Віцебская | 1864 | 5,1 | 4,5 | 5,8 | -1,3 |
| Магілёўская | 1871-1881 | 18,8 | 20,0 | 17,6 | 2,4 |
| *Гарады* | | | | | |
| Мінская | 1858 | 18,2 | 20,9 | 15,2 | 5,7 |
| Магілёўская | 1859 | 23,4 | 24,2 | 22,5 | 1,7 |
| Гродзенская | 1859 | 19,7 | 22,7 | 17,1 | 5,6 |
| Гродзенская | 1864 | 15,6 | 16,9 | 14,1 | 2,7 |
| Віцебская | 1862 | – | – | – | – |
| Віцебская | 1863 | 8,0 | 6,6 | 9,7 | -3,0 |
| Віцебская | 1864 | 4,8 | 3,6 | 6,4 | -2,8 |
| Магілёўская | 1871-1881 | 25,0 | 26,0 | 24,0 | 2,0 |

Выключыўшы з аналізу даныя пра дзіцячую смяротнасць па Віцебскай губерні, можна прасачыць наступную заканамернасць: доля дзяцей, памерлых ва ўзросце да 15 год, ад агульнай колькасці смерцяў была вышэй у сельскай мясцовасці, чым у гарадах. На павышэнне долі памерлых дзяцей у сельскай мясцовасці магла паўплываць перавага дзяцей ва ўзроставай структуры сельскіх папуляцый. Разам з тым, у гарадах зафіксавана больш высокая доля немаўлят, якія памерлі да года, у параўнанні з сельскай мясцовасцю (гл. табліцу 1). Каэфіцыент смяротнасці немаўлят у гарадах таксама вышэйшы, чым у сельскай мясцовасці (гл. табліцу 2).

Вельмі падобна, што паказчык смяротнасці немаўлят, разлічаны на падставе матэрыялаў Памятных кніжак беларускіх губерняў, таксама заніжаны. Так, паводле даных П.І. Куркіна, у перыяд з 1881 па 1903 год на тэрыторыі Расійскай імперыі з кожных 100 народжаных немаўлят паміралa ад 24% да 30%, самы нізкі ўзровень дзіцячай смяротнасці не апускаўся ніжэй за 23% [12, с. 27]. Каэфіцыент дзіцячай смяротнасці, разлічаны намі на падставе даных па Магілёўскай губерні за дзесяцігадовы перыяд з 1871 па 1881 гг. у сельскай мясцовасці склаў 18,8%, у гарадах – 25%, што набліжаецца да паказчыкаў, указаных П.І. Куркіным.

Прычына недаўліку смяротнасці немаўлят тлумачыцца тым, што ў дарэвалюцыйнай Расіі не існавала грамадзянскай рэгістрацыі нараджэнняў і смерцяў, гэтыя звесткі падаваліся ў дзяржаўныя органы прадстаўнікамі духавенства, якія ўносілі адпаведныя запісы ў метрычныя кнігі. Аднак на самой справе метрычныя кнігі адлюстроўвалі колькасць царкоўных абрадаў, што здзяйсняліся над народжанымі альбо памерлымі, але не фактычную колькасць народжаных ці памерлых [13, с. 45–46]. Неадпаведнасць колькасці народжаных колькасці выкананых абрадаў хрышчэння тлумачыцца тым, што хрышчэнне не атрымлівалі мёртванароджаныя, а таксама народжаныя і памерлыя адразу пасля нараджэння нехрышчонымі. Немаўляты, якія памерлі да хрышчэння, не траплялі ў метрычныя запісы, звязаныя з рэгістрацыяй смерцяў, паколькі адпаведны хрысціянскі абрад, звязаны з пахаваннем, не праводзіўся.

Назіранне, паводле якога дзіцячая смяротнасць у сельскай мясцовасці была вышэйшая, чым у гарадах (пры павышанай смяротнасці ў гарадах немаўлят), адпавядае агульным тэндэнцыям, адзначаным раней дэмографамі. У якасці галоўнай прычыны высокай смяротнасці сялянскіх дзяцей С.А. Навасельскі называў шырокае распаўсюджанне ў вёсках інфекцыйных захворванняў пры адсутнасці неабходнай медыцынскай дапамогі. У гарадах медыцынскае абслугоўванне было больш даступным, частка гарадскога насельніцтва ўжо мела ўяўленні пра элементарныя нормы гігіены [13, с. 17]. Супярэчлівы, на першы погляд, факт павышанай смяротнасці гарадскіх немаўлят можна растлумачыць лепшым станам рэгістрацыі дзіцячай смяротнасці ў гарадах. Вядома, што максімум смерцяў немаўлят прыходзіцца на першы месяц жыцця, і прагматыка сельскага жыцця вымагала не спяшацца з хрышчэннем нованароджаных, паколькі гэтая працэдура патрабавала ад сям'і значных выдаткаў. Згодна этнаграфічных звестак, хрышчэнне немаўлят у беларускай вёсцы звычайна адбывалася праз 2-3 тыдні пасля нараджэння [14, с. 50], у сувязі з чым дзеці, якія памерлі да сканчэння гэтага перыяду, не траплялі ў царкоўныя метрыкі.

***Смяротнасць дарослых у залежнасці ад полу.*** З табліцы 1 відаць, што ў сельскай мясцовасці сярод індывідаў, якія памерлі ў дарослым узросце, пераважаюць жанчыны. Гэта можна патлумачыць колькаснай перавагай прадстаўніц жаночага полу, якія жылі ў сельскай мясцовасці (табліца 3). Статыстычныя даныя па Віцебскай губерні зноў супярэчаць адзначанай агульнай тэндэнцыі. Так, згодна матэрыялам Памятных кніжак за 1863 і 1864 гг., у сельскай мясцовасці доля памерлых жанчын была меншая, чым мужчын (гл. табліцу 1), нягледзячы на колькасную перавагу жанчын у структуры жывой папуляцыі (гл. табліцу 3), а вось даныя за 1862 г. паказваюць істотна завышаны ў параўнанні з іншымі губернямі паказчык долі памерлых жанчын (гл. табліцу 1).

Ва ўсіх гарадскіх выбарках доля памерлых дарослых мужчын значна перавышае долю жанчын (гл. табліцу 1). Перавага мужчын у структуры памерлых дарослых у гарадах лёгка тлумачыцца колькаснай перавагай мужчын у складзе тагачаснага гарадскога насельніцтва (гл. табліцу 3). Такая дыспрапорцыя суадносін палоў была тыповай для гарадоў Расійскай імперыі другой паловы XIX – пачатку XX ст. і тлумачыцца тым, што ў гарадах пражывала значная колькасць прышлага мужчынскага насельніцтва (навучэнцы, вайскоўцы, рабочыя) [13, с. 13; 10, с. 30]. Статыстычныя даныя па Віцебскай губерні зноў паказваюць прыклад анамаліі: так, згодна з данымі за 1864 г. у складзе гарадскога насельніцтва пераважаюць мужчыны, пры гэтым адзначаецца максімальная ў гарадскіх выбарках доля жанчын сярод памерлых. Уся сукупнасць адзначаных фактаў паказвае на тое, што статыстычныя даныя пра смяротнасць па Віцебскай губерні не адпавядаюць рэальнасці.

Табліца 3. – Колькасныя суадносіны індывідаў мужчынскага і жаночага полу ў складзе гарадскга і сельскага насельніцтва

| Губерня | Год | Абсалютная колькасць, чал. | | | Працэнтныя суадносіны | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Муж. пол | Жан. пол | Разам | Муж. пол | Жан. пол | Розніца |
| *Сельская мясцовасць* | | | | | | | |
| Мінская | 1858 | 442312 | 453934 | 896246 | 49,4 | 50,6 | -1,3 |
| Магілёўская | 1859 | 402856 | 426348 | 829204 | 48,6 | 51,4 | -2,8 |
| Гродзенская | 1859 | 358564 | 375190 | 733754 | 48,9 | 51,1 | -2,3 |
| | 1864 | 377539 | 392178 | 769717 | 49,0 | 51,0 | -1,9 |
| Віцебская | 1862 | 343080 | 351892 | 694972 | 49,4 | 50,6 | -1,3 |
| | 1863 | 332285 | 343282 | 675567 | 49,2 | 50,8 | -1,6 |
| | 1864 | 346340 | 354776 | 701116 | 49,4 | 50,6 | -1,2 |
| *Гарады* | | | | | | | |
| Мінская | 1858 | 47128 | 43093 | 90221 | 52,2 | 47,8 | 4,5 |
| Магілёўская | 1859 | 36698 | 34995 | 71693 | 51,2 | 48,8 | 2,4 |
| Гродзенская | 1859 | 55049 | 49726 | 104775 | 52,5 | 47,5 | 5,1 |
| | 1864 | 66052 | 55284 | 121336 | 54,4 | 45,6 | 8,9 |
| Віцебская | 1862 | 56722 | 48664 | 105386 | 53,8 | 46,2 | 7,6 |
| | 1863 | 51049 | 50123 | 101172 | 50,5 | 49,5 | 0,9 |
| | 1864 | 61487 | 51297 | 112784 | 54,5 | 45,5 | 9,0 |

***Узроставае размеркаванне смяротнасці***. На малюнках 1–3 прадстаўлены дыяграмы, на якіх паказана колькасць памерлых у розных узроставых інтэрвалах (з улікам полу). Ва ўсіх выпадках можна назіраць карціну ўзроставага размеркавання смерцяў, характэрную для грамадстваў з т.зв. традыцыйным, ці патрыярхальным, тыпам узнаўлення: максімальная смяротнасць прыходзіцца на ранні дзіцячы ўзрост, ва ўзросце каля 15-ці год смяротнасць дасягае свайго мінімуму, пасля чаго паступова павялічваецца з цягам часу.

На ўсіх дыяграмах, пабудаваных як для гарадскога, так і для сельскага насельніцтва, ва ўзросце да 5-ці гадоў назіраецца перавышэнне колькасці памерлых хлопчыкаў у параўнанні з дзяўчынкамі. У дарослым узросце пачынаюць праяўляцца адрозненні характару мужчынскай і жаночай смяротнасці ў гарадскога і сельскага насельніцтва. У сельскай мясцовасці, пачынаючы з узросту каля 20-ці гадоў, адзначаецца некаторае павышэнне колькасці памерлых жанчын у параўнанні з мужчынамі. Падобная карціна была характэрна для тэрыторыі ўсёй еўрапейскай часткі Расіі таго часу і тлумачыцца цяжкімі ўмовамі жыцця вясковых жанчын (павышаная рэпрадуктыўная нагрузка ў спалучэнні з інтэнсіўнай працай у сельскай гаспадарцы) [13, с. 9]. У гарадах назіраецца адваротная сітуацыя, відавочнай становіцца павышаная, у параўнанні з жанчынамі, смяротнасць мужчын працаздольнага ўзросту. Асабліва выражаны пікі смяротнасці гарадскіх мужчын у Магілёўскай губерні ва ўзроставым інтэрвале 20–30 гадоў (малюнак 2), у гарадах Гродзенскай губерні – у інтэрвале 20–40 гадоў (малюнак 3).

Факт павышанай, у параўнанні з сельскім насельніцтвам, смяротнасці гарадскіх мужчын працаздольнага ўзросту быў тыповай для большасці еўрапейскіх гарадоў канца XIX – пачатку XX стст. з'явай [13, с. 8]. У якасці прычыны С.А. Навасельскі называе больш шкодныя, у параўнанні з земляробствам, умовы гарадской працы, а таксама больш шырокае распаўсюджанне алкагалізму сярод жыхароў горада. Апроч таго, у гарадскіх бальніцах часцей паміралі сельскія мужчыны, якія атрымалі сур'ёзныя пашкоджанні [13, с. 12]. Пры гэтым на жанчын, на думку С.А. Навасельскага, негатыўныя фактары гарадскога жыцця аказвалі меншы ўплыў [13, с. 9].




**Малюнак 1. – Узроставае размеркаванне смяротнасці ў Мінскай губерні паводле даных за 1858 г.**




**Малюнак 2. – Узроставае размеркаванне смяротнасці ў Магілёўскай губерні паводле даных за 1859 г.**




**Малюнак 3. – Узроставае размеркаванне смяротнасці ў Гродзенскай губерні паводле даных за 1859 г.**

**Заключэнне.** Такім чынам, у выніку праведзенага даследавання можна зрабіць наступныя высновы.

Не ўсе статыстычныя даныя пра пола-ўзроставае размеркаванне смяротнасці, апублікаваныя ў Памятных кніжках губерняў, адлюстроўваюць рэальную карціну смяротнасці насельніцтва. У прыватнасці, статыстычныя матэрыялы па Віцебскай губерні дэманструюць істотны недаўлік смяротнасці немаўлят і дзяцей і хаатычнае размеркаванне смяротнасці дарослых з улікам полу. Статыстычныя матэрыялы Памятных кніжак Мінскай, Гродзенскай і Магілёўскай губерняў прыдатныя для дэмаграфічнага аналізу і ў цэлым пацвярджаюць заканамернасці, раней устаноўленыя дэмографамі. Разам з тым, ёсць падставы меркаваць, што ў сельскай мясцовасці ўлік смерцяў немаўлят аж да канца XIX ст. быў пастаўлены горш, чым у гарадах.

Доля памерлых дзяцей ад агульнага ліку смерцяў вышэй у сельскай мясцовасці, чым у гарадах. З аднаго боку, гэта было абумоўлена перавагай дзяцей ва ўзроставай структуры сельскіх папуляцый, з іншага боку – павышанай смяротнасцю сельскіх дзяцей, абумоўленай шырокім распаўсюджаннем інфекцыйных захворванняў, дрэнным станам санітарна-гігіенічнага рэжыму, недаступнасцю кваліфікаванай медыцынскай дапамогі.

Ва ўсіх гарадскіх выбарках доля памерлых дарослых мужчын значна перавышае долю памерлых жанчын, што тлумачыцца колькаснай перавагай мужчынскага насельніцтва ў гарадах 2-й паловы XIX – пачатку XX ст. У сельскай мясцовасці назіраецца адваротная сітуацыя.

І ў гарадах, і ў сельскай мясцовасці назіраецца павышаная смяротнасць хлопчыкаў ва ўзросце да 5 гадоў у параўнанні з дзяўчынкамі. У дарослым узросце пачынаюць выяўляцца адрозненні характару мужчынскай і жаночай смяротнасці ў гарадах і сельскай мясцовасці. У сельскай мясцовасці, пачынаючы з 20 гадоў, назіраецца некаторае павышэнне колькасці памерлых жанчын у параўнанні з мужчынамі. У гарадах назіраецца адваротная сітуацыя, смяротнасць мужчын працаздольнага ўзросту значна перавышае жаночую смяротнасць.

## ЛИТАРАТУРА


1. Корсак О.В. Деятельность статистических комитетов белорусских губерний по сбору и обработке статистических сведений // Научные труды Республиканского института высшей школы. Исторические и психолого-педагогические науки. – 2017. – № 17-1. – С. 182–189.
2. Памятная книжка Минской губернии на 1861 год / Изд-е Минск. губ. стат. комитета. – Минск: Тип. губ. правления, 1861. – 293 с.
3. Памятная книжка Могилёвской губернии на 1861 год. – Могилев: Тип. Губ. Правления, 1861 г. – 465 с.
4. Памятная книжка Гродненский губернии на 1860 г. Календарные, адресные и справочные сведения по губернии / издана Губернским Правлением. – Гродно: Тип. губ. правления, 1860. – 410 с.
5. Памятная книжка Гродненский губернии на 1866 г. Календарные, адресные и справочные сведения по губернии / издана Гродненским Губернским Правлением. – Гродно: Гродн. стат. комитет, 1866. – 205 с.
6. Памятная книжка Витебской губернии на 1864 год: с тринадцатью политипажами в тексте и портретом архиепископа Полотского и Витебского Василия / издана Губернским статистическим Комитетом; под ред. А.М. Сементовского, секретаря Комитета Императорских Обществ Русского Географического и Вольного Экономического члена-сотрудника. – СПб.: В тип. К. Вульфа, 1864. – VIII, 415 с.
7. Памятная книжка Витебской губернии на 1865 год: с портретом почетного члена комитета Михаила Николаевича Муравьева, тринадцатью политипажами и планом г. Витебска / издана Витебским губернским статистическим комитетом; под ред. А.М. Сементовского, секретаря комитета, императорских обществ Русского географического и Вольного экономического члена-сотрудника. – СПб.: Тип. К. Вульфа, 1865. – VIII, 376, 128, 7 с.
8. Памятная книжка Витебской губернии на 1866 год: год третий / издана Витебским Губернским статистическим комитетом; под ред. А.М. Сементовского. – Г. 3-й . – СПб.: Тип. К. Вульфа, 1866. – VI II, 218, 144 с.
9. Саітава В.І., Страмужэўская Т. В. [Кузьмініч Т.В.]. Памятныя кніжкі беларускіх губерняў: агульная характарыстыка [Электронны рэсурс] // Памятные книжки Виленской губернии (1845—1915) / Национальная библиотека Беларуси. – Минск, 2014. – 8 с.
10. Опыт описания Могилевской губернии / Могилевский губернский статистический комитет; сост. по прогр. и под ред. А.С. Дембовецкого. Кн. 2. – Могилев: Тип. губ. правления, 1884. – 990 с.
11. Куркинъ П.И. Смертность малыхъ детей. Статистика детской смертности. Изъ лекций весенняго семестра 1911 г. – М.: Изд-во Моск. о-ва борьбы с детской смертностью, 1911. – 34 с.
12. Куркин П.И. Смертность грудных детей. – М.: Изд-во Наркомздрава, 1925. – 60 с.
13. Новосельский С.А. О различияхъ въ смертности городского и сельскаго населения Европейской России. – М.: Типо-лит. В. Рихтер, 1911. – 23 с.
14. Кухаронак Т. І. Радзінныя звычаі і абрады беларусаў: канец XIX – XX ст.. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 126 с.


*Паступіў 05.12.2023*

# ПАМЯТНЫЕ КНИЖКИ ГУБЕРНИЙ КАК ИСТОЧНИК ДЛЯ ИЗУЧЕНИЯ СМЕРТНОСТИ ПРАВОСЛАВНОГО НАСЕЛЕНИЯ БЕЛАРУСИ ВТОРОЙ ПОЛОВИНЫ XIX ВЕКА

***канд. биол. наук, доц. О.А. ЕМЕЛЬЯНЧИК***
***(Полоцкий государственный университет имени Евфросинии Полоцкой)***

*В статье представлены результаты анализа статистических данных, опубликованных в Памятных книжках белорусских губерний за 1858–1864 гг. Установлено, что статистические данные о смертности Памятных книжек Витебской губернии за 1862–64 гг. не являются достоверными, и характеризуются существенным недоучётам детской смертности. Пики смертности во всех исследованных группах приходятся на ранний детский возраст. Доля умерших детей от общего количества смертей выше в сельской местности, чем в городах. И в городах, и в сельской местности наблюдается повышенная смертность мальчиков в возрасте до 5 лет по сравнению с девочками. Во взрослом возрасте начинают проявляться различия характера мужской и женской смертности в городах и сельской местности. В сельской местности отмечается некоторое повышение числа умерших женщин репродуктивного возраста по сравнению с мужчинами. Для городов характерна обратная ситуация: смертность мужчин трудособного возраста значительно превышает женскую смертность.*

***Ключевые слова:*** *Памятные книжки губерний, статистика смертности, городское и сельское население, половозрастное распределение смертности.*

# MEMORABLE BOOKS OF PROVINCES AS A SOURCE FOR STUDYING THE MORTALITY OF THE ORTHODOX POPULATION OF BELARUS IN THE SECOND HALF OF THE 19TH CENTURY

***V. YEMIALYANCHYK***
***(Euphrosyne Polotskaya State University of Polotsk)***

*The article presents the results of the analysis of statistical data published in the Memorable Books of Belarusian provinces for 1858 – 1864. It has been established that the statistical data on mortality in the Memorable Books of Vitebsk province for 1862 – 64 are not reliable and are characterised by significant undercounting of child mortality. The peak of mortality in all cases occurs in early childhood. The share of child deaths in the total number of deaths is higher in rural areas than in urban areas. In both urban and rural areas, boys under 5 years of age have higher mortality rates than girls. In adulthood, differences in male and female mortality patterns in urban and rural areas begin to emerge. In rural areas, there is a slight increase in the number of deaths of women of reproductive age compared to men. In urban areas, the opposite situation is observed, the mortality rate of men of working age significantly exceeds the female mortality rate.*

***Keywords:*** *Memorable books of provinces, mortality statistics, urban and rural population, sex and age distribution of mortality rate.*